Источник: "Наша слова" - 2014-10-29

# 80 гадоў з дня нараджэння Карласа Шэрмана



**Карлас ШЭРМАН** (25 кастрычніка 1934, Мантэвідэа, Уругвай - 4 сакавіка 2005) - беларуска-іспанскі перакладчык, літаратар і праваабаронца.

Нарадзіўся ў сям'і рабочага - выхадца з Заходняй Беларусі. Вучыўся ў Нацыянальным інстытуце імя М. Марэна (Буэнас-Айрэс, Аргенціна, 1951-1956) па спецыяльнасці філалогія. Працаваў у аргенцінскіх газетах. У 1956 прыехаў на Беларусь. У 1964-1980 - загадчык рэдакцыйна-выдавецкага сектара Фундаментальнай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР. З 1989 - віца-прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра. Член СП СССР (з 1979).

Дэбютаваў у аргенцінскім перыядычным друку ў 1952, у рускай перыёдыцы Беларусі - з 1964, на беларускай мове - з 1975. З іспанскай мовы на рускую пераклаў раман М. Сапата Алівелы (ісп.) бел. "Чорны загон" (часопіс "Неман", 1967), раман Г. Гарсія Маркеса "Восень патрыярха" (з В. Тарасам, Масква, 1978), на беларускую мову пераклаў паасобныя творы Н. Гільена (руск.) бел., Г. Гарсія Маркеса, Ф. Піта Радрыгеса (ісп.) бел., О. Фернандэса, У. Дзітаранта, С. Ібаргоена, К. Кастэльотэ, Э. Кардэналя (руск.) бел., Д. Алонса (руск.) бел. і інш., а таксама выбраную лірыку А. Тэхада Гомеса (ісп.) бел. (1987). У перакладзе з беларускай на іспанскую выйшлі "Мая Беседзь" А. Куляшова, "Конь і леў" М. Танка, "Чырвоны мак" В. Хомчанкі, народныя казкі ў апрацоўцы А. Якімовіча (усе ў 1976), "Шлюбная ноч" І. Шамякіна (1980), "Дажыць да світання" (1980), "Абеліск" (1984) і "У тумане" (1989) В. Быкава, выбранае Я. Купалы і Я. Коласа "Папараць-кветка" (1982), выбранае Р. Барадуліна "Чорны вол маёй трывогі" (1985), "Плач перапёлкі" І. Чыгрынава (1988), "Загад № 1" М. Чаргінца (1990).

Аўтар кніг паэзіі "Дождж у Каралішчавічах" (на іспанскай мове, у перакладзе на беларускую Р. Барадуліна, 1984) і "Сны" (у перакладзе з іспанскай Р. Барадуліна і В. Сёмухі, 1989).

Склаў зборнікі выбранай лірыкі Федэрыка Гарсія-Лоркі (1975), П. Неруды (1976), Н. Гільена (1977), Габрыелы Містраль (1984), а таксама анталогію сучаснай кубінскай паэзіі "Тытунёвая кветка" (1986).

***Вікіпедыя.***